*Канцавой М.М. (Брэст); Борсук Н.М. (Брэст) – навук. кіраўнік*

## «ПАД ПУЦЯВОДНАЙ ЗОРКАЮ МАКСІМА...»: ПАЭТЫЧНЫЯ НАБЫТКІ СТУДЭНТАЎ БрДТУ

У Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце вучыцца таленавітая моладзь, якая піша прозу, паэзію, не грэбуе і публіцыстыкай. З іх паэтычнымі набыткамі можна пазнаёміцца ў рубрыцы «Проба пера» ўніверсітэцкай газеты «Наша газета» (рэдактар – Т. Шульга), а таксама на старонках перыядычнага друку (газеты «Заря», «Брестский курьер», «Знамя юности»). Дзякуючы намаганням Таццяны Юр'еўны Шульгі, сябра, аднадумцы таленавітай моладзі, творчыя напрацоўкі будучых будаўнікоў, эканамістаў, праграмістаў, гідратэхнікаў і г.д. сабраны пад адной вокладкай – у зборніку «И физики, и лирики...». На сённяшні дзень налічваецца шэсць выпускаў гэтага выдання.

Таленавітая моладзь добра знаёма з творчасцю паэта-гуманіста, філосафа, эстэта, адраджэнца М. Багдановіча, творчасць якога многімі пакаленнямі ўспрымаецца як узор «гармоніі, цэласнасці, мастацкай дасканаласці»[1, с. 463]. Напярэдадні 120-годдзя з дня нараджэння беларускага класіка хочацца засяродзіць увагу на найбольш надзённых, актуальных тэмах спадчыны М. Багдановіча, якія кранаюць душы, думкі нашых сучаснікаў.

Аналіз вершаў-прысвячэнняў М. Багдановічу паказвае, што, нягледзячы на тое, што няма прамых нашчадкаў багдановічаўскага роду, ёсць на Беларусі нашчадкі яго па духу. Верш студэнта будаўнічага факультэта Д. Шынка «Слова да беларуса» – сведчанне таго, што і ён імкнецца выявяць сваю творчасць,

жыццёвую пазіцыю, мастакоўскую самасць па творчых набытках беларускага класіка. Імя М. Багдановіча асацыіруецца для пачынаючага творцы з паняццем Бацькаўшчыны. Ён упэўнены, што свае найлепшыя якасці – шчырасць, самаадданасць, дабрыню – беларусы выкарыстаюць дзеля прыгожага, мілага, роднага, любімага краю, бо жывуць яны «пад пуцяводнай зоркаю Максіма».

Творчае сталенне З. Дудзюк супала з гадамі навучання яе ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Менавіта ў гэты час яна захапілася творчасцю М. Багдановіча. Як успамінае Зінаіда Іосіфаўна, яе вабіў тонкі лірызм, глыбокі псіхалагізм, адчуванне беларускасці (паэт заставаўся беларусам, нягледзячы ні на якое асяроддзе). Яскравы доказ вышэйвыказанай думкі – верш-прысвячэнне З. Дудзюк беларускаму класіку «Цябе мне ўбачыць толькі з дальняй зоркі».

Пры аналізе вершаў М. Багдановіча назіраецца цікавая заканамернасць: «Прастора ў пераважнай большасці вершаў Багдановіча неабмежаваная, часцей за ўсё яна касмічная – «паміж небам і зямлёй»[2, с. 63]. Вобраз зорнага неба займае прыкметнае месца ў паэзіі М. Багдановіча. На гэта ўказвалі літаратуразнаўцы А. Лойка, У. Конан, М. Стральцоў, А. Кабаковіч, І. Навуменка. Для герояў паэтычных твораў, змешчаных на старонках зборнікаў «И физики, и лирики...», матыў вышыні, начнога неба – гэта таксама шлях да духоўнага самаўдасканалення, да ажыццяўлення, здавалася б, самых неверагодных мар: *Нежно ночь укрывает ресницы / Покрывалом из звёздных теней. / И тебе этой ночью приснится / Пусть касанье ладони моей»* (В. Нячаева, верш «В твоём сне»); *Закат на небе догорает / И дымкой белой над водой / Туман тихонько застилает / Тот светлый берег, тот прибой* (Н. Дзенісюк, верш «Закат на небе догорает»).

Туга па страчанай гармоніі для гераіні З. Дудзюк асабліва абвастраецца ў вячэрні, начны час: *І я беспрытульна між зор халадзею* (верш «Самота скупая»). Душэўны боль сваёй гераіні паэтка ўзмацняе радкамі: *ноч тугі сляпой* (верш «Аднойчы гэта ўжо было»), *неба п'е тугу начамі* (верш «Надыдзе старасць»), *атрутную самоту піць начамі* (верш «Дзе возера закута белатой»), *смяротны дух начэй* (верш «Зноў я зусім бязвольная пры волі»), а М. Куцэнка ўводзіць у верш «Закутано небо тучами» вобраз хмар: *Закутано небо тучами...* Тым не менш, вочы гераінь і З. Дудзюк, і М. Куцэнка *прагна звернуты да неба, / Нібы палёгка стуль калі прыйшла»* (верш «Зноў я зусім бязвольная пры волі»).

Зорнае неба блаславўляе каханне лірычных герояў З. Дудзюк (*нас заручылі зоркі, якая сінь зышла на нас з нябёс* – верш «Асцерагуся варажыць на лёс»). Вышыня, веліч неба набліжаюць нас разам з героямі нашых сучаснікаў да разгадкі таямніцы кахання: *Лети навстречу небесам, / Опережая свет зари. / Там тебе сердце я отдам. / Лети же, милая, лети!* (М. Мухаў, верш «Крылья любви»); *Под небом чистым совершенным / Молчал в преддверии тоски, / И всё казалось мне волшебным, / Неимоверно колдовским!* (Т. Мароз, верш «Мороз, луна и еле уловимый»); таямніцы творчасці: *Черноглазая ночь тихо*

*манит тебя / Вдохновенья крылом, / Облекая стремленья твои в чудотворное / Слово* (Ю. Монін, верш «Черноглазая ночь»).

Перад тварам неба, зораў, «трапяткі і балючы дотык» якіх адчувае чытач разам з героямі творцаў БрДТУ, вырашаецца лёс Радзімы. Ю. Монін любіць свой народ і спачувае яму, змучанаму гадамі гістарычнай крыўды. Нават у небе ён бачыць адбітак трагічнай гісторыі свайго краю: *О, небо! / Всегда беспристрастный свидетель / Вплетенья событий в века. / В лазоревом поле все вехи отметит: / В лёт – летописью – облака* (верш «Небо»).

Зорнае неба стала сведкам самаахвярнай смерці мужных сыноў за вызваленне Бацькаўшчыны ад фашысцкіх захопнікаў у вершы З. Дудзюк «Зямныя зоркі»: *Чырвоныя зоркі зямныя / З бетонnных пліт вырастаюць. / Над кожнаю брацкай магілай, / Над кожным курганам ззяюць. / У здзіўленні неба: / «У Зямлі такія сузор'і!* Апошнімі двума радкамі З. Дудзюк падкрэслівае, што нябесная краса прайграе спаборніцтва з зямною красою, з духоўнай прыгажосцю людзей, што зрабілі свядомы выбар насустрач смерці дзеля захавання жыцця і міру на планеце Зямля. Яны — «наша памяць, наша гордасць, наша гора», іх жыццё-імгненне ўвасоблена ў чырвоных зорках над кожнай брацкай магілай, у нябесных зорах, пад вартаю якіх, як сцвярджае паэтка, знаходзіцца наш край.

М. Багдановіча з аднолькавай сілай вабіла хараство летняй, восеньскай, зімовай і вясновай прыроды. Важная рыса паэта як прыродаапісальніка, адзначаў А. Лойка, што ў яго адносна мала вершаў «сузіральніцкіх па адносінах да прыроды»[3, с. 68]. Традыцыя разглядаць восень як сталасць чалавечага веку тлумачыцца натурфіласофскім падыходам. Гэта ідзе з часоў Геракліта, Платона, адпавядае і народнай філасофіі і эстэтыцы. «Восень, – лічыць сучасная даследчыца А. Хатэнка, – мае сваю мелодыку. Яна не просіць літасці і спагады, як вясна дзеля завязі, не бунтуе цягай зачыну, як лета, не песціць надзею на абуджэнне, як зіма. Восень рахункуе. Яна мудра і прасветлена бачыць, хто чаго варты на крыжы сусветных дарог» [4, с. 69].

Думаецца, па гэтай прычыне свет восеньскай прыроды арганічна ўвайшоў у паэзію маладых творцаў: «Я и осень дышим одинаково» (В. Амелічкіна). Восеньскія краявіды нагадваюць, што перагорнута яшчэ адна старонка жыцця: *Мешают краски осень и зима, / Мечты летят, в тех красках утопая* (М. Куцэнка верш «А листья падают на старые дома»); *Пожелтевшие листья сравнялись с землёй, / И луне побледневшей пора на покой. / В сером небе всё реже слышны голоса / Моих чувств...* (Р. Раманюк, верш «Моя осень»). Ці не таму ў восеньскіх краявідах дамінуе матыў увядання жыцця. Працытаваныя вершаваныя радкі – яскравы прыклад таго, што згаданыя паэты тонка, далікатна і дакладна перадаюць ўзгодненасць, сугучнасць чалавечых пачуццяў са зменамі ў прыродзе. Пра гэта ў свой час трапна заўважыў аўтарытэтны літаратуразнаўца і фалькларыст А. Ліс: «Восень, аб гэтым сведчыць практыка сусветнага мас-

тацтва, асабліва паэзіі, – пара, багатая не толькі на фарбы прыроды, але і носьбіт вытанчанай гамы настрою, здольнага глыбока западаць у чалавечую душу і абуджаць у ёй складаны комплекс пачуццяў, знаходзіць змястоўны эмацыянальны рэзананс» [5, с. 146]. Магчыма, па гэтай прычыне скразны матыў пераважнай большасці вершаў, сабраных у зборніку, восеньскі: *Осень за окном в жёлтом сарафане / Плакала дождём серыми глазами. / Плакала она об ушедшем лете. / Слёзы вытирал ей бродяга-Ветер. / С кольцами росы на листах-ладошках, / В красных, как огонь, из рябин серёжках, / Распустив свои золотые косы, / В шорохе листвы проходила осень* (В. Амелічкіна).

Як бачна, нашы сучаснікі адчуваюць патрэбу асэнсоўваць праблему ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў аспекце «чалавек-прырода-асоба». Шырыня і глыбіня яднання такіх паняццяў, як неба, зямля, чалавек, па нашым пераканнні, выразна выяўлены ў наступных радках М. Багдановіча: *Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы* (верш «Ноч»). Услед за беларускім класікам І. Спаднеўская сцвярджае: *Любой меня на мириады выше, / Ведь я – пылинка за твоим плечом. / Но каждый ли из них умеет слышать / Листа паденье в воздухе ночном?* (верш «Любой меня на мириады выше»).

Вершы студэнтаў, напісаныя па-беларуску, гавораць пра тое, што наша моладзь не ставіцца абыякава да роднай мовы. Яна выразна ўсвядоміла думку, выказаную М. Багдановічам у артыкуле «Голос из Белоруссии»: «Выцясняючы беларускую мову са школы, мы вядзём да растраты вынікаў аграмаднай, шматвяковай духоўнай работы цэлага народа, збіваем думку дзіцяці са звыклых псіхалагічных сцяжынак і груба ўрэзваем яго душэўны свет; уводзячы ж мову велікарускую, мы ставім на яго шляху шэраг перашкод, засяляем яго псіхіку вобразамі змярцвелымі, няяснымі і ў многіх выпадках зусім недарэчнымі»[6, т. 3, с. 202]. Творчыя набыткі нашых студэнтаў дапамагаюць сёння не страціць надзею і веру, што яшчэ адзін народ не знікне з твару зямлі.

На мову І. Навіцкая (верш «Родная мова») глядзіць як на вялікі скарб, дарунак Бога, матэрыяльна прадстаўлены, выпакутаваны, здабыты болем і крывёй папярэдніх пакаленняў. Яе ўяўленне аб шчаслівай долі асацыіруецца з гаворкаю на роднай мове. Для І. Навіцкай беларускае слова ўвабрала ў сябе і колер небасхілу, і пах зялёнага лесу, і сілу ветру, які «выівае сум», і цеплыню летняга сонейка...

Значнае месца ў творча-эстэтычнай канцэпцыі М. Багдановіча адводзіцца культу жаночай красы. Пачуццё пакланення перад каханай альбо каханым выявілі маладыя паэты праз займеннікі «Ты», «Тебя» (Т. Паўлюковіч у вершы «Я никогда Тебя не ждала»). На наш погляд, маладая паэтка гэтым падкрэслівае, што кожнае імгненне, пражытае побач з каханым, змяшчае ўсю паўнату быцця. Шчыры ў сваім захапленні дзяўчынай і Дзмітрый Чайкоўскі (верш «Тебе»). Цеплынёй, пяшчотай прасякнуты наступныя радкі:*«И линией красок, и точкою каждой / Картина моя отражает Тебя.* Шкада, безумоўна, што ў мінулым засталіся часы А. Блока, М. Багдановіча,

калі да жанчыны звярталіся з асабліваю павагаю на «Вы»: Вами, Мадонна, Царица, Царевна, Жанчына, цудоўная Пані... Будзённае «ты» з маленькай літары ў звароце да дзяўчыны Д. Чайкоўскі дазваляе толькі ў апошнім чатырохрадкоўі, асабістым, напісаным для сябе: *В нём много тепла, твоей нежности, ласки... / Прекрасней тебя никого в мире нет!*

Пераважная большасць вершаў, змешчаных на старонках зборнікаў «И физики, и лирики», прысвечана тэме кахання. Праведзены аналіз вершаў сведчыць: істотная рыса інтымнай паэзіі – паважлівыя, надзвычай чыстыя, далікатныя, высакародныя адносіны да Кахання, якія выступаюць крытэрыем чалавечнасці ў творчасці сучаснікаў.

М. Багдановіч усё сваё жыццё адстойваў ідэю чалавечага збліжэння і еднасці. У сцвярджэнні гэтай гуманістычнай ідэі не апошнюю ролю адыгралі старыя формы, якія вабілі паэта гарманічнасцю пабудовы, строгай унутранай логікай, далучалі яго да высокай культуры мастацкага мыслення. Нягледзячы на тое, што доўгі час жанравая форма трыялета не прызнавалася афіцыйнай крытыкай, яна жыве, і год ад году ў ёй паглыбляецца медытатыўны пачатак, закладзены М. Багдановічам. «Триолет о жизни» І. Стадніка напоўнены роздумам аб сэнсе духоўнага быцця асобы. Дзякуючы першаму радку, які паўтараецца тройчы, згодна структуры (лічба «3» – сімвал усяго духоўнага), аўтар некрыкліва і неназойліва дапамагае адчуць чытачу ўнутраную непаўнавартасць жыцця, калі чалавек жыве адзінока, замкнёна. Такім чынам, трыялет убірае ў сябе асновы маральна-этычных нормаў паводзін чалавека ў грамадстве.

Заслуга М. Багдановіча бачыцца нам яшчэ і ў тым, што ён, маючы грунтоўныя веды па нямецкай, польскай, італьянскай, лацінскай, французскай, старажытнагрэчаскай мовах, змог данесці да чытача беларускім словам еўрапейскую эстэтычна-філасофскую думку. Перакладчыцкая дзейнасць Л. Тумашчык, Т. Шульгі, А. Мешык вядзе іх па шляху пошуку новых спосабаў зрабіць паэзію філасофіяй жыцця, сродкам самадасканалення і адухаўлення.

Аналіз паэтычнай творчасці студэнтаў БрДТУ паказаў, што і сярод будучых праграмістаў, будаўнікоў, эканамістаў ёсць нашчадкі па духу вялікага М. Багдановіча. Традыцыі беларускага класіка сталі той мастацкаю сілаю, уздзеянне якой, няхай нават на падсвядомым узроўні, але адчулі на сваёй творчасці таленавітыя пачынаючыя творцы. Самае істотнае, на наш погляд, што ўсе пачаткоўцы рухаюцца па ўласным паэтычным шляху, іх творы вызначаюцца самастойнасцю, самабытнасцю.

## Літаратура

1. Чабан, Т. Космас «Вянка». Літаратурны каментарый да «Вянка» Максіма Багдановіча / Т. Чабан // Багдановіч М. Збор твораў: у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1. – С. 463–518.

2. Кабаковіч, А. Паэзія Максіма Багдановіча. Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага / А. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 136 с.

3. Лойка, А. Максім Багдановіч / А. Лойка. – Мінск : Навука і тэхніка. – 1966. – 335 с.

4. Хатэнка, А. Па прыступках лесвіцы вечнай. Восень у прыродзе і чалавечым лёсе / А. Хатэнка // Роднае слова. – 1993. – № 8. – С. 66–73.

5. Ліс, А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў : Сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А. Ліс. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 188 с.

6. Багдановіч, М. Збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991 – 1995.